Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

21 ЛЮТАГА 2008 г. ЧАЦВЕР
№ 34 (26147)

Кошт 430 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

## Узнагароджанне за ўладальніцкі нагляд будзе непасрэдна залежаць ад рэнтабельнасці і чыстага прыбытку гаставарыстваў

У Беларусі грашовае ўзнагароджанне за ўладальніцкі нагляд з 1 красавіка 2008 года будзе непасрэдна залежаць ад узроўню рэнтабельнасці гаспадарчага таварыства і наяўнасці чыстага прыбытку па выніках дзейнасці за справаздачны перыяд. Такое палажэнне змяшчаецца ва ўказе прэзідэнта Беларусі № 100, які рэгулюе некаторыя пытанні ўладальніцкага нагляду.

Дакументам вызначаны асобы, якія могуць назначацца прадстаўнікамі дзяржавы ў органах кіравання гаспадарчых таварыстваў, акцыі (долі ў статутных фондах) якіх належаць Рэспубліцы Беларусь. Гэта могуць быць як работнікі (у тым ліку дзяржаўныя служачыя) дзяржаўных органаў і арганізацый, якія ўпаўнаважаны кіраваць акцыямі (якія ажыццяўляюць уладальніцкі нагляд), так і грамадзяне, якія заключылі грамадзянска-прававыя дагаворы з такімі органамі і арганізацыямі.

Урад устанаўлівае парадак назначэння гэтых прадстаўнікоў дзяржавы, падставы для спынення іх паўнамоцтваў, а таксама патрабаванні, што прад'яўляюцца да іх, іх правы і абавязкі.

Нарматыў налічэння памеру ўзнагароджання прадстаўніку дзяржавы ўстанаўліваецца ў базавых велічынях у залежнасці ад узроўню рэнтабельнасці гаспадарчага таварыства. Але пры ажыццяўленні ўладальніцкага нагляду ў банках памер узнагароджання прадстаўніку дзяржавы абмяжоўваецца максімальным нарматывам без уліку рэнтабельнасці, што звязана з асаблівасцямі рэгулявання банкаўскай дзейнасці.

Рэалізацыя палажэнняў указа будзе садзейнічаць больш эфектыўнаму ўдзелу прадстаўнікоў дзяржавы ў органах кіравання гаспадарчых таварыстваў, акцыі (долі ў статутных фондах) якіх належаць Рэспубліцы Беларусь.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Прэзідэнт Беларусі назначыў суддзяў Канстытуцыйнага суда

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка 19 лютага сваім указам назначыў суддзямі Канстытуцыйнага суда Аляксандра Марыскіна, Валянціну Падгрушу, Вольгу Сяргееву і Лілію Козыраву, вызваліўшы яе ад пасады намесніка старшыні і суддзі Вышэйшага Гаспадарчага Суда Рэспублікі Беларусь з наступным паведамленнем аб яе вызваленні Савету Рэспублікі Нацыянальнага сходу.

## Беларусь і Польшча падпішуць пагадненне аб эксплуатацыі пагранічнага ўчастка Аўгустоўскага канала

Прэзідэнт адобрыў у якасці асновы для правядзення перагавораў праект міжурадавага пагаднення з Польшчай аб эксплуатацыі пагранічнага ўчастка Аўгустоўскага канала. Указ аб гэтым Аляксандр Лукашэнка падпісаў 19 лютага. На правядзенне перагавораў і падпісанне пагаднення ўпаўнаважаны старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Саўчанка.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Сёлета будзе пададзена каля 100 тысяч дэкларацый

Кампанія дэкларавання сукупнага гадавога даходу сёлета ажыццяўляецца ў спакойным безажыятажным рэжыме, — паведаміла карэспандэнту «Звязды» начальнік галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асобаў Міністэрства па падатках і зборах Галіна Радзюкевіч.

У інспекцыях амаль няма чэргаў, а падаткаплацельшчыкі задаволены працай падатковых работнікаў, — лічыць суразмоўца. Пакуль сёлета колькасць пададзеных дэкларацый прыкладна ў 2,5—3 разы менш чым летась. На 10 лютага ў інспекцыі пададзена каля 39 тысяч дэкларацый аб сукупным гадавым даходзе.

Разам з тым спецыялісты МПЗ упэўнены, што максімальная актыўнасць удзелу насельніцтва ў кампаніі па дэклараванні звычайна прыпадае на трэцюю дэкаду лютага. Таму Галіна Радзюкевіч разлічвае, што сёлета дэкларацыі аб сукупным гадавым даходзе пададуць каля 100 тысяч чалавек.

Начальнік упраўлення запэўніла, што падатковыя органы і сёлета будуць выкарыстоўваць механізм абавязковага дэкларавання для работнікаў тых арганізацый, дзе існуюць шэрыя схемы атрымання заробку ў канвертах. Дэкларацыі будуць патрабаваць у першую чаргу ў тых выпадках, калі да падатковікаў трапіць інфармацыя аб афармленні буйных здзелак з нерухомай маёмасцю або аб набыцці дарагіх аўтамабіляў, абсталявання ці інш. Сёлета падатковую дэкларацыю аб сукупным гадавым даходзе за 2007 год неабходна падаць да 3 сакавіка ўключна.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Сёння — Міжнародны дзень роднай мовы



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Студэнтка 1-га курса філфака Белдзяржуніверсітэта, пераможца некалькіх рэспубліканскіх алімпіяд па беларускай мове Вераніка Сташулёнак каля адзінага ў свеце помніка беларускай літары «Ў», што ў Полацку.**

Добры дзень, родныя словы

## ПІ НАГБОМ СЫРАДОЙ РОДНАЙ МОВЫ!

**Па-руску: «родной язык», па-нямецку: «Muttersprache» (матчына мова). А ў беларускай мове яны адназначныя: родная мова і матчына мова.**

*Бо з матчыных вуснаў найперш прыходзяць разам з яе ласкаю да малечы родныя словы. І таму яны асабліва дарагія, як назаўсёды дарагое маленства. І я помню іх: з вуснаў мамы Алесі, таты Кастуся, дзядулі Міхалкі, бабкі Альжбеты, мамінай мамы Мар'яны, а мамінага бацькі не чуў: ён не дажыў да ўнука.*

А яны чулі беларускія словы ад сваіх бацькоў і дзядоў, маіх ужо і прадзедаў, і прапрадзедаў.

Сёння навукай засведчана: яшчэ ў лоне маці дзіця ўслухоўваецца ў гукі роднай мовы. На родных словах цяпло нашых продкаў. Яны як пацалунак тых, каго ўжо і ніколі не ўбачыш.

**(Заканчэнне на 3-й стар.)**

*Штогод 21 лютага адзначаецца Міжнародны дзень роднай мовы. Гэта «моўнае» свята было ўстаноўлена ЮНЕСКА ў 1999 годзе. Родная мова — гэта адначасова і культура, і лад думак, спадчына і народа, і ўсяго чалавецтва. Паводле звестак ЮНЕСКА, у свеце існуе каля 6000 жывых моў. Палова з іх знаходзіцца на мяжы знікнення. На 96 працэнтаў моў размаўляе толькі 4 працэнты насельніцтва. 80 працэнтаў афрыканскіх моў не маюць пісьменнасці. Штогод вымірае каля дзесятка моў...*

*«Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб ня ўмерлі...» — гэтыя словы Францішка Багушэвіча гучаць сёння як запавет.*

*Са святам роднай мовы!*

## Дзяржузнагародамі Беларусі адзначаны амаль 50 работнікаў прамысловасці, медыцыны, сферы адукацыі, культуры

**Адпаведны ўказ кіраўнік дзяржавы падпісаў 19 лютага.**

Ордэнам Айчыны III ступені ўзнагароджаны рэктар Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта Іван Жарскі.

Ордэнам Пашаны ўдастоены першы намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Уладзімір Сямашка, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Аляксандр Папкоў, дырэктар Палаца Рэспублікі Пётр Волкаў і дырэктар ВПУП «ВІПРА» Беларускага таварыства глухіх Аляксандр Грэс. Галоўны дырыжор Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра Беларусі імя І. Жыновіча Міхаіл Казінец узнагароджаны ордэнам Францыска Скарыны.

Медалём «За адвагу» ўзнагароджаны старшы прапаршчык міліцыі Аляксандр Казакевіч, сяржант міліцыі Дзмітрый Купцоў, капітан міліцыі Аляксей Тарасаў, медалём «За адзнаку ў ахове грамадскага парадку» — сяржант міліцыі Уладзімір Палоннік і старшына міліцыі Андрэй Сівакоў...

Сярод узнагароджаных медалём «За працоўныя заслугі» галоўны дырыжор Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра Аляксандр Анісімаў, начальнік рэспубліканскага мостабудаўнічага ўнітарнага прадпрыемства «Мостаатрад № 425» г. Віцебска Аляксандр Бандарэнка, галоўны ўрач мінскай 6-й гарадской клінічнай бальніцы Віктар Гурко...

Медалём Францыска Скарыны адзначаны генеральны дырэктар ТАА «Кёнігсберг Трэйдынг» Міхаіл Грыб, старшыня савета Федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі «Беларусы Расіі» Францішак Каўрыга, старшыня савета нацыянальна-культурнай аўтаноміі «Беларусь» у Рэспубліцы Комі Аркадзь Крупенька, намеснік дырэктара па культуры Новасібірскай гарадской грамадскай арганізацыі «Беларускі культурна-асветны цэнтр у імя святой Ефрасінні Полацкай» Людміла Счасліўенка.

Гэтай узнагароды ўдастоены і вядучы майстар сцэны Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага Аксана Лясная, дэкан фартэпіяннага і кампазітарска-музыказнаўчага факультэта Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Уладзімір Няхаенка, мастацкі кіраўнік грамадскага творчага саюза «Славянскі круг» пры ЗАТ «Будаўнічая кампанія «Партнёр» Сяргей Костачка, мастак-жывапісец, член Беларускага саюза мастакоў Валерый Шкаруба, а таксама работнікі Беларускай дзяржаўнай ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга філармоніі: мастацкі кіраўнік Дзяржаўнага камернага хору Наталля Міхайлава, артыст размоўнага жанру вышэйшай катэгорыі Уладзімір Радзівілаў, рэпетытар па вакалу ансамбля «Сябры» Мікалай Сацура.

Ганаровае званне народнага мастака Беларусі прысвоена мастаку-скульптару, члену Беларускага саюза мастакоў Івану Міско...

Першаму намесніку старшыні праўлення ААТ «Ашчадны банк «Беларусбанк» Валянціне Лук'яненка прысвоена ганаровае званне «Заслужаны эканаміст Рэспублікі Беларусь».

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### СЯРЭДНЯЯ ПРАЦОЎНАЯ ПЕНСІЯ — БОЛЬШ ЗА 170 ДОЛАРАЎ

**Выплата пенсійнай «прыбаўкі» за люты будзе зроблена ў сакавіку — адначасова з сакавіцкай пенсіяй. Аб гэтым у гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» паведаміў намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Валерый Кавалькоў.**

У сувязі з прыняццем указа кіраўніка дзяржавы аб павышэнні пенсій, агульныя выдаткі Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва на гэтыя мэты ўзрастуць прыкладна на 50 млрд рублёў. Разам з тым, адзначылі ў міністэрстве, хваляваціся наконт тэрмінаў выплат не варта — неабходныя грошы ёсць. Дарэчы, варта нагадаць, што сярэдняя працоўная пенсія ў краіне павялічылася на 6,1 працэнта і складзе 366,3 тыс. рублёў, або больш за 170 долараў у эквіваленце. Пры гэтым памер мінімальнай пенсіі па ўзросце будзе адпавядаць 165,6 тыс., максімальнай пенсіі працуючых пенсіянераў пры стажы 45 гадоў у мужчын, 40 гадоў у жанчын і індывідуальным каэфіцыенце 1,3 — 413,3 тыс., а памер максімальнай пенсіі непрацуючых пенсіянераў пры такім жа стажы і каэфіцыенце 4,0 і вышэй — 569,4 тыс. рублёў.

**Сяргей ГРЫБ.**

### СЕЛЬСКІ ТУРЫЗМ ЯК СРОДАК ПРЫЦЯГНЕННЯ ВАЛЮТЫ

**Такую надзею на развіццё сельскага турызму ўскладае сёння дзяржава. Пра гэта на першай спецыялізаванай канферэнцыі «Аграэкатурызм у Рэспубліцы Беларусь — стан і перспектывы развіцця» сказаў першы намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Юрый Алымаў.**

Для развіцця сельскага турызму створаны самыя льготныя ўмовы ва ўсёй эканамічнай сферы краіны. Гэта і льготы па падаткаабкладанні, і спрошчаныя ўмовы рэгістрацыі, і магчымасці ўзяць ільготны крэдыт на развіццё, які прадастаўляе Белаграпрамбанк. «Зараз у Савеце Міністраў разглядаецца праект указа Прэзідэнта Беларусі «Аб некаторых пытаннях ажыццяўлення дзейнасці ў сферы аграэкатурызму», адным з пунктаў якога прапаноўваецца распаўсюдзіць дзеянне Указа № 372 на фізічных асобаў, якія пражываюць у малых гарадскіх пасяленнях (з колькасцю насельніцтва да 20 тыс. чалавек), што дасць магчымасць многім гарадскім жыхарам займацца аграэкатурызмам. — сказаў на канферэнцыі намеснік міністра эканомікі Рэспублікі Беларусь Андрэй Тур. — Гэта дазволіць у некалькі разоў павялічыць колькасць вясковых сядзіб».

Сёння ў рэспубліцы зарэгістравана 188 суб'ектаў агратурызму, летась яны абслужылі 18 тысяч турыстаў. На цяперашні час гэта від турызму, які развіваецца найбольш дынамічна.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

### БІЗНЭС НА АЛКАГАЛІЗМЕ

**Урач-нарколаг Свіслацкай цэнтральнай раённай бальніцы пераўтварыў сваю пасаду ў крыніцу непрацоўных прыбыткаў.**

Паводле звестак упраўлення інфармацыі і сувязяў з грамадскасцю Генеральнай пракуратуры, медык аказваў садзейнічанне ў атрыманні вадзіцельскіх пасведчанняў асобам, якія злоўжывалі спіртнымі напоямі. У прыватнасці, карыстаючыся сваім службовым становішчам, ён да заканчэння курса лячэння здымаў з уліку хранічных алкаголікаў, уносіў адпаведныя звесткі ў амбулаторныя карты і выдаваў фіктыўныя даведкі аб стане здароўя. Зразумела, што падобныя паслугі былі не бясплатныя. За кожную фіктыўную даведку пацыенты плацілі ад 60 да 80 тысяч рублёў. Апроч таго, прадпрымальны ўрач лячыў сваіх пацыентаў па завышаных коштах. У прыватнасці, падчас правядзення імплантацыі алкаголікам прэпаратаў «Дысульфірам» і «Эспераль» ён патрабаваў аплату ў памеры 60—80 тысяч рублёў. Хоць кошт падобных аперацый з улікам прэпаратаў не больш за 6—7 тысяч. Розніцу лекар клаў сабе ў кішэнь. Усяго, як высветліла пракуратура, нядобрасумленны ўрач падзарабіў на заганнай звычцы сваіх пацыентаў больш чым 1 мільён рублёў. Адметна, што хоць пракуратура Свіслацкага раёна і вывела на чыстую ваду карупцыянера ў белым халаце, але на лаву падсудных ён не трапіў. Прадпрымальны лекар быў накіраваны на лячэнне ў псіхіятрычным шпіталі.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

### НЕПАЎНАЛЕТНІ НЕЛЮДЗЬ

**У Магілёўскім абласным судзе неўзабаве пачнецца разгляд жудаснага злачынства, якое адбылося ў Бабруйску.**

Паводле звестак упраўлення інфармацыі і сувязяў з грамадскасцю Генеральнай пракуратуры, на лаве падсудных апынецца 15-гадовы падлетак. Як устанавіла следства, у жніўні мінулага года ён выкраў 10-гадовага хлопчыка з мэтай атрымання выкупу. Але выкрадальніка нешта так раз'юшыла, што ён у той жа дзень утапіў свайго закладніка. А назаўтра непаўналетні нелюдзь патэлефанаваў маці забітага ім хлопчыка і запатрабаваў выкуп у памеры 3 тысяч долараў... Міліцыя выявіла і затрымала падлетка. Высветлілася, што апроч выкрадання і забойства чалавека, на яго рахунку яшчэ два крадзяжы маёмасці.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

### АДНЫХ ЗА ПАЛЯВАННЕ, ДРУГІХ — ЗА РЫБАЛОЎСТВА...

**Двойчы на працягу дня — і кожны раз на трох парушальнікаў — складалі пратаколы работнікі Салігорскай міжрайінспекцыі аховы жывёльнага і раслíннага свету.**

Напачатку па інфармацыі Слуцкага лясгаса яны прыбылі ў раён вёскі Вежы, дзе супрацоўнікі лясгаса ўжо затрымалі трох жыхароў сталіцы за паляванне ў забаронены час забароненым спосабам (з-пад святла фараў у начны час з выкарыстаннем механічнага транспартнага сродку). Канфіскаваны ружжо і патроны.

А потым складаліся матэрыялы ў дачыненні да трох жыхароў Салігорска, якія былі затрыманы супрацоўнікамі дэпартамента «Аховы» Салігорскага РАУС за здабычу рыбы сеткамі і «павуком». Апошнія канфіскаваны, як і 32 кілаграмы здабычы. Урон прыродным рэсурсам нанесены на суму 172 базавыя велічыні.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### КАНДЫДАТ У ПРЭЗІДЭНТЫ РАСІІ ВЫСТУПІЎ ЗА НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ РУСКАЙ ПРЫБАЛТЫКІ

**Кандыдат у прэзідэнты Расіі, лідар ЛДПР Уладзімір Жырыноўскі ў адказ на рашэнне Эстоніі прызнаць незалежнасць Косава даў зразумець, што ў гэтым выпадку эстонцы могуць наступіць на ўласныя граблі.**

Як мяркуе Жырыноўскі, зыходзячы з гэтага, рускае насельніцтва ў Прыбалтыцы таксама мае права стварыць уласную рэспубліку па прыкладзе Косава. «У рускіх у Эстоніі, куды больш правоў стварыць маленькую дзяржаву, чым у албанцаў у Косаве», — заявіў віцэ-спікер Дзярждумы РФ.

### ЭКС-ПРЭЗІДЭНТ ПОЛЬШЧЫ ЯРУЗЕЛЬСКІ ШПІТАЛІЗАВАНЫ Ў ЦЯЖКІМ СТАНЕ



**Генерал Войцэх Ярузельскі шпіталізаваны ў ваенны шпіталь Варшавы.**

Урачы ацэньваюць яго стан як цяжкі, паведаміла журналістам яго жонка Барбара Ярузельская. Паводле яе слоў, у 84-гадовага экс-прэзідэнта запаленне лёгкіх, а таксама праблемы з сэрцам. «Мне здаецца, што ў мужа няма вялікага жадання жыць далей», — сказала яна.

Як пісала ўжо «Звязда», генерала Ярузельскага на радзіме абвінавачваюць ва ўводзе ў Польшчы ваеннага становішча ў снежні 1981 года.

### НОВЫМ ПРЭЗІДЭНТАМ АРМЕНІІ СТАЎ ПРЭМ'ЕР СЕРЖ САРКІСЯН

**Аб гэтым паведаміў старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Арменіі Гарэгін Азаран пасля апрацоўкі 100 працэнтаў выбарчых бюлетэняў.**

Саркісян упэўнена перамог у першым туры выбараў, набраўшы 52,86 працэнта галасоў выбаршчыкаў. Паводле 51-га артыкула Канстытуцыі Арменіі, прэзідэнтам рэспублікі становіцца кандыдат, які набраў 50 працэнтаў плюс адзін голас выбаршчыкаў, што ўзялі ўдзел у галасаванні. Разам з тым у Ерэване ўчора прайшлі акцыі пратэсту апазіцыі, у прыватнасці, прыхільнікаў экс-прэзідэнта Лявона Тэр-Петрасяна. Яны лічаць, што не Саркісян, а іх кандыдат перамог у першым жа туры. Хоць, згодна з інфармацыяй ЦВК Тэр-Петрасян набраў усяго 21 працэнт галасоў.

### ЮНАЯ БРЫТАНКА ГАТОВАЯ ПАДЗЯЛІЦЦА ДЗВЮМА ЛІШНІМІ НЫРКАМІ



18-гадовая жыхарка Лідса Лаура Мун гатовая падзяліцца дзвюма лішнімі ныркамі з людзьмі, якія маюць патрэбу ў перасадцы донарскага органа. Чатыры здаровыя ныркі, якія нармальна функцыянуюць, былі выяўленыя ў дзяўчыны падчас абследавання, праведзенага пасля аўтамабільнай аварыі.

### МУЗЫКА АДНАЎЛЯЕ ПАМЯЦЬ ПАСЛЯ ІНСУЛЬТУ

**Пацыентам, якія нядаўна перанеслі інсульт, карысна слухаць музыку.**

З яе дапамогай можна не толькі палепшыць настрой, але і паскорыць узнаўленне памяці і ўвагі, парушаных у выніку хваробы. Фінскія навукоўцы прапанавалі выкарыстаць музыкатэрапію ў якасці дадатковага метаду рэабілітацыі пацыентаў.

Погляд

## ЯКІМ БЫЦЬ СЁЛЕТА ЗАРПЛАТАМ?..




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Перспектывы нашай эканомікі — пытанне, якое абмяркоўваюць не толькі аналітыкі, цікавіць яно ўсіх нас, бо мы разумеем, што ад поспехаў у развіцці краіны будзе залежаць і канкрэтна наш дабрабыт. У прыватнасці, тое, якую заўтра атрымаем зарплату, па якіх цэнах давядзецца жыць? У гэтай сувязі, прыцягнуўшы да размовы <u>эксперта «Звязды», дэкана эканамічнага факультэта БДУ, прафесара Міхаіла КАВАЛЁВА,</u> мы паспрабавалі высветліць, напрыклад, тыя праблемныя пытанні, што могуць паўплываць на развіццё нашай эканомікі.**

— Леташні год быў вельмі цяжкім, але і вельмі паспяховым для беларускай эканомікі, — лічыць Міхаіл Кавалёў. — Заплаціўшы (у параўнанні з папярэднім годам) дадаткова больш за 1,5 мільярда долараў ЗША за нафту і газ, мы, тым не меней, даволі істотна нарасцілі і экспарт. Праўда, нашы амбіцыйныя планы на будучае патрабуюць і значнага імпарту, і таму мінулы год мы закончылі з адмоўным сальда па таварах амаль у 4 мільярды долараў. Гэтая значная сума часткова перакрывалася кароткатэрміновымі пазыкамі — доўг краіны за год вырас. Сёлета давядзецца плаціць працэнты па ўзрослых даўгах. Таму, нягледзячы на тое, што ў гэтым годзе двайнога павышэння цэнаў на энерганосьбіты няма, нагрузка на эканоміку будзе па-ранейшаму вялікай.

**— Трэба меркаваць, што толькі гэтым справа не абмяжуецца: мабыць, іншыя фактары, у прыватнасці, сусветныя, таксама будуць уплываць на айчынную эканоміку?**

— Па-першае, будзе працягвацца сусветная доларавая інфляцыя. Па-другое, — рост цэнаў на рэсурсы, прычым не толькі на энерганосьбіты. З аднаго боку, — гэта для нас добра, напрыклад, па калійных угнаеннях. З іншага — дрэнна па тых рэсурсах, якія мы купляем за мяжой. Гэта таксама будзе падганяць інфляцыю.

Амбіцыйныя планы па мадэрнізацыі эканомікі, па будаўніцтве новых заводаў, жылля, спартыўных збудаванняў, гасцініц і г.д. Яны будуць патрабаваць значнага імпарту. У выніку за мяжой мы па-ранейшаму будзем купляць больш, нягледзячы на ўсе нашы намаганні па нарошчванні экспарту.

**(Заканчэнне на 2-й стар.)**

Расследаванне

## Чаму не гарыць ВЕЧНЫ агонь?

**На выездзе з Мінска ў магілёўскім напрамку знаходзіцца страшнае месца. Некалькі гектараў зямлі тут проста перамяшаны з попелам ды астанкамі людзей, знішчаных у Вялікую Айчынную вайну ў канцэнтрацыйным лагеры «Трасцянец». Так, гутарка будзе звязана з гэтым сумна вядомым канцлагерам, а калі сказаць больш дакладна — то з абеліскам, усталяваным ля вёскі Вялікі Трасцянец.**

...Калі ехаць з боку Магілёва ў Мінск, то недалёка ад уезду ў сталіцу, леваруч, знаходзіцца аўтобусны прыпынак «Вялікі Трасцянец», ад якога адыходзіць пешаходная алея, а ўдалечыні — віднеецца гранітны абеліск. Зусім нядаўна і цалкам выпадкова лёс занёс мяне туды. Паглядзеў я на абеліск здалёк, з магілёўскай шашы, дый, думаю, трэба падысці бліжэй. Іду па алеі, азіраюся вакол: чысценька, смецця няма, відаць, што камунальныя службы працуюць добра. Дайшоў да абеліска. На ім надпіс: «Тут, у раёне вёскі Трасцянец, нямецка-фашысцкія захопнікі расстралялі, закатавалі, спалілі 201 500 чалавек мірных грамадзян, партызан, ваеннапалонных Савецкай Арміі». Побач — брацкая магіла салдат, якія загінулі пры вызваленні Мінска ў 1944 годзе. Ля помнікаў ляжаць кветкі і вянкі, непадалёк — некалькі лавачак. Атмасфера, каб апусціць позірк да зямлі, памаўчаць некалькі хвілін ды ўспомніць ахвяраў гэтай жудаснай вайны... Аднак мой погляд чапляецца за месца, дзе, па ідэі, павінен гарэць Вечны агонь. Падыходжу бліжэй — сапраўды, месца для агню ёсць, а самога агню — няма.

### Куды падзеўся агонь?

Стаю ля абеліска, спрабую зразумець, як так магло здарыцца, што ля памятнага знака на месцы аднаго з найбуйнейшых канцлагераў не гарыць Вечны агонь. Пытаюся пра гэта ў мясцовага жыхара.

*— А таму, — адказвае ён, — што тут увечары розныя бамжы збіраюцца, яны на ім ледзь што шашлыкі не смажылі. Некалькі разоў гасілі яго. Таму агонь гады тры таму і адключылі зусім. Зараз запальваюць толькі напярэдадні вялікіх святаў — Дня Перамогі, Дня Незалежнасці... Прыходзьце 23 лютага, будзе гарэць!*

Падзякаваў я мужчыну за інфармацыю дый стаю далей. А тут жанчына ідзе. Ну я да яе з тым жа пытаннем.

*— Я лічу, што эканомяць,* — кажа яна.

— А тут мне дагэтуль мужчына расказваў, што тут збіраюцца розныя асацыяльныя элементы... — трохі здзіўлены яе адказам, спрабую праверыць гіпотэзу майго першага суразмоўцы.



*— Ой, моладзь збіраецца кожны вечар. Тут лаўкі паставілі — дык зусім бардак стаў. Бедная прыбіральшчыца кілаграмы смецця кожную раніцу выграбае...*

«Ага, — думаю сабе, развітаўшыся з жанчынай, — значыць, ёсць дзве версіі: 1) агонь патушылі з-за, мякка кажучы, нявыхаваных кампаній, якія збіраюцца тут увечары і зняважаюць памятнае месца; 2) з-за эканоміі грашовых сродкаў на паліве для агню». Была яшчэ і трэцяя версія, звязаная з сапсаванасцю механізма падачы газу, аднак яна адразу знікла, бо агонь на святы такі ўключаюць, значыць — тэхнічны бок тут ні пры чым. Даў сабе абяцанне высветліць сапраўдную прычыну адсутнасці Вечнага агню.

### Хто перамог?

Назаўтра я ўжо быў у адміністрацыі Заводскага раёна горада Мінска (справа ў тым, што хоць абеліск і знаходзіцца па-за межамі сталіцы, на тэрыторыі Мінскага раёна, але стаіць на балансе Мінска, а дакладней — Заводскага раёна). Вось што мне расказала **Людміла БАРАНОЎСКАЯ, намеснік кіраўніка адміністрацыі Заводскага раёна г. Мінска:**

*— На жаль, цяпер у моладзі такое выхаванне: яны не разумеюць, што такое Вечны агонь, а што — вогнішча. І гэты Вечны агонь яны пераўтварылі ў мангал для шашлыкоў. Закідвалі яго смеццем. Полымя магло згаснуць у любы момант і прывесці да надзвычайнай сітуацыі. Таму зараз (ужо трэці год) агонь запальваецца толькі падчас правядзення якіх-небудзь мерапрыемстваў.*

Акрэсліла Людміла Бараноўская і праблему, звязаную са знаходжаннем памятнага знака на мяжы раёна і горада:

*— Тэрыторыя Вялікага Трасцянца — гэта тэрыторыя Мінскага раёна. І Заводскі раён не можа арганізоўваць пастаянныя дзяжурствы ці пасты ля помніка, бо гэта не наша зямля. Мы ўзялі помнік на свой баланс, адрамантавалі яго і таму адказваем за сам абеліск. А вось парк вакол яго — гэта ўжо Мінскі раён...*

**(Заканчэнне на 4-й стар.)**

ISSN 1990 - 763X

08034>

КУРСЫ ВАЛЮТ

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 21.02.2008 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 147,00 |
| 1 еўра | 3 160,28 |
| 1 латвійскі лат | 4 538,15 |
| 1 літоўскі літ | 915,25 |
| 1 чэшская крона | 124,81 |
| 1 польскі злоты | 881,85 |
| 1 расійскі рубель | 87,46 |
| 1 украінская грыўня | 428,54 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 24,5486 |
| 10 UAH | 48,1458 |
| 1000 BYR | 11,4193 |
| EUR | 36,1036 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 20.02.2008 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

